# Творчае аб’яднанне «Бацькаўшчына»

*Выкладчык беларускай мовы і літаратуры*
*Кармішына Вольга Міхайлаўна*






У нашым каледжы ўжо не першы год працуе творчае аб’яднанне “Бацькаўшчына”. Удзельнікі гуртка далучаюцца да багатай самабытнай культуры беларускага народа, спазнаюць вопыт продкаў, асаблівасці этнасу. Абагульняюць набытыя веды пра Беларусь, яе гісторыю, традыцыі і дасягненні.




Праграма гуртка дазваляе далучаць вучнёўскую моладзь да ўсебаковага вывучэння сваёй малой радзімы, адраджэння рэгіянальных культурных традыцый і абрадаў, захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй малой радзімы і краіны.



Пагружэнне ў краязнаўчую дзейнасць дае ўяўленне аб асаблівасцях жыцця, побыце, традыцыях, гісторыі, святах і абрадах – аб тым, што ўключае ў сябе паняцце «менталітэт беларускай нацыі».



Работа аб’яднання спрыяе адраджэнню абрадавай культуры беларускага народа, садзейнічае патрыятычнаму, ідэалагічнаму, эстэтычнаму і маральна-этычнаму выхаванню вучняў.





# Музейная экспазіцыя «Беларуская хатка» вучыць і выхоўвае

*В.М.Кармішына,*
*педагог дадатковай адукацыі*
*першай катэгорыі*



Трэба ведаць – сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося…
Як сахой даўней аралі,
Як смыком зямлю бярлялі,
Як з сявалкі збожжа-зерне
Рассявалі чорнай жменяй…
Трэба ведаць, што зазналі,
Як на пана працавалі…
Трэба ведаць і пра тое,
Апраналі што? Якое?..

*«Наш музей»*
*Пятрусь Броўка.*

У кабінеце беларускай мовы і літаратуры нашага каледжа размешчаны этнаграфічны куток “Беларуская хатка”.

Ён быў заснаваны ў 1986 годзе і налічвае вялікую колькасць экспанатаў, якія сабраны настаўнікамі, навучэнцамі і мясцовымі жыхарамі горада Баранавічы і Баранавіцкага раёна. Асноўная мэта работы этнаграфічнага кутка – стварэнне сістэмы выхавання навучэнцаў на духоўных скарбах беларускага народа і далучэння іх да нацыянальнай спадчыны.







 

«Беларуская хатка» – прымае пад свой дах усіх жадаючых: навучэнцаў, настаўнікаў, гасцей. Для іх прапануецца экскурсія пра побыт нашых дзядоў і прадзедаў.

Усе экспанаты зроблены рукамі мясцовых майстроў.

Вяртацца да старога ўкладу жыцця не варта, але ведаць, як жылі нашы дзяды і прадзеды – неабходна!

## Творчае аб’яднанне па інтарэсам «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

**Кіраўнік: Кармішына Вольга Міхайлаўна, педагог дадатковай адукацыі**



**Мэта творчага аб’яднання:** фарміраванне ўсебакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца сродкамі турызму і краязнаўства.

**Задачы творчага аб’яднання:**

- папулярызацыя роднай мовы;
- фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі, маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры, культуры сямейных зносін;
- падрыхтоўка да самастойнага жыцця і працы;
- уцягванне навучэнцаў у пошукава-даследчую дзейнасць сродкамі турызму і краязнаўства;
- пашырэнне ведаў па гісторыі, геаграфіі, біялогіі, экалогіі, атрыманых ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

Праграма гуртка дазваляе далучаць вучнёўскую моладзь да ўсебаковага вывучэння сваёй малой радзімы, адраджэння рэгіянальных культурных традыцый і абрадаў, захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй малой радзімы і краіны.

Пагружэнне ў краязнаўчую дзейнасць дае ўяўленне аб асаблівасцях жыцця, побыце, традыцыях, гісторыі, святах і абрадах – аб тым, што ўключае ў сябе паняцце «менталітэт беларускай нацыі».

Работа аб’яднання спрыяе адраджэнню абрадавай культуры беларускага народа, садзейнічае патрыятычнаму, ідэалагічнаму, эстэтычнаму і маральна-этычнаму выхаванню вучняў.


МУЗЕЙ-СЯДЗІБА
Адама Міцкевіча
«ЗАОССЕ»



